# АГНОНІМЫ ЯК ЛІНГВІСТЫЧНА-КАГНІТЫЎНАЯ КАТЭГОРЫЯ ЛЕКСІКІ

*Бельмач Я.Д., Пілевіч Д.А.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Албут А.А. – старшы выкладчык*

Разглядаюцца агнонімы – мала- або зусім невядомыя лексічныя адзінкі. Гэты пласт лексікі фарміруецца індывідуальна падчас маўленча-кагнітыўнай дзейнасці, аднак ёсць перадумовы для аднясення слоў да патэнцыйных агнонімаў, звязаныя з часавай і сацыяльнай стратыфікацыяй лексікі. З мэтай разгледзець , як функцыянуе агнанімія як лексіка-кагнітыўная з’ява, было праведзена апытанне. Навуковае асэнсаванне феномена агнонімаў дазволіць павысіць узровень культуры маўлення і расшырыць кгругагляд грамадства.

існуюць як мінімум чатыры тыпы лексікі ў кагнітыўным аспекце: 1) словы, якія мы больш-менш добра ведаем і рэгулярна ўжываем (такіх слоў кожны сярэднестатыстычны адукаваны носьбіт мовы ўжывае каля 10 тыс.); 2) словы, якія мы часам блытаем паміж сабой, бо яны падобныя па сваёй знешняй форме і маюць нешта агульнае у сваім значэнні (параўн.: *абагуліць* і *абагульніць*, *дослед* і *досвед* і да т.п.); 3) словы, якія мы

ўспрымаем як знаёмыя (прынамсі, недзе іх чулі, чыталі), але практычна не выкарыстоўваем, дакладна не ведаем іх семантыку, змест, задавальняемся тым, што адносім іх да пэўнай прадметнай тэмы (напрыклад, *колі* – гэта сабака, *драцэна* – расліна, *вельбот* – плаўсродак і да т.п.); 4) словы, з якімі мы фактычна не сустракаемся, не ведаем ці не хочам ведаць іх, але яны рэальна юнуюць, выкарыстоуваюцца вузкімі коламі грамадства (спецыялютамі пэўных галін ведаў, носьбітамі асобных гаворак, некаторымі сацыяльнымі групамі насельніцтва і інш.). Такія малавядмыя чалавеку словы называюць агнонімамі. Даследаванню агнонімаў прысвечаны наступныя навуковыя крыніцы: [1–3].

Узнікненне агнонімаў мае дзве крыніцы: часавыя і сацыяльныя. Некаторыя словы становяцца незразумелымі з прычыны рэдкага ўжывання ў пэўны перыяд часу. Гэта могуць быць новыя намінацыі (напрыклад, *багет* 'разьбяная або пафарбаваная планка, з якой робяць рамы, карнізы', *талстоўка* 'шырокая, догая мужчынская кашуля ў складку, з поясам'), якія пасля могуць стаць шырокавядомымі. Сюды таксама адносяцца словы, якія выйшлі з ужытку. Другая крыніца агнонімаў звязана з сацыяльным асяроддзем, у якім чалавек жыве і расце. Калі асоба ў працэсе свайго развіцця не сутыкаецца з пэўнымі словамі, яны становяцца ёй незразумелымі. Агнонімы можна сустрэць у розных тэкстах, дзе яны будуць мець розныя крыніцы, бо паходзяць з розных сфер жыцця. Напаўзабытыя архаізмы, якія выйшлі з ужытку, таксама губляюць свой сэнс і тым не менш ужываюцца, напрыклад, для стылізацыі: *перст* 'палец', *весь* 'вёска'. *Цунамі* 'гіганцкія ўсёразбуральныя хвалі, якія ўзнікаюць на паверхні акіяна падчас падводных землятрусаў' і *кансьерж* 'швейцар пры доме (у Францыі)' – раней гэтыя словы былі невядомыя многім людзям, але зараз яны часта ўжываюцца ў размове, распаўсюджаныя дзякуючы СМІ, масавай культуры. Аднак этымалогію падобных лексем не кожны можа ведаць.

Асобныя нячастыя словы чалавек можа ацэньваць суб'ектыўна, яны здаюцца яму нязвыклымі і нязграбнымі праз няведанне і неразуменне гэтых адзінак. Але гэта не значыць, што трэба абмяжоўвацца толькі агульнавядомымі словамі. Дзякуючы сучасным тэхналогіям значэнне невядомага слова можна паглядзець у інтэрнэце, анлайн-слоўніках. Лексіка сама па сабе выступае самай дынамічнай і адчувальнай для вонкавых фактараў часткай моўнай сютэмы. Гэтак і лексікон асобнага чалавека індывідуальны і зменлівы Тым не менш улік наяўнасці такой лінгвістычна-кагнітыўнай катэгорыі як агнонімы бачыцца важным для людзей, чыя праца звязана са стварэннем тэкстаў, працы са словам, арыентаванай на шырокую і стракатую аўдыторыю. Таму бачыцца важным ва ўсіх сферах жыцця і стылях мовы аўтарам ставіць сябе на месца адрасата, каб пасняхова выбіраць лексічныя сродкі і дасягаць правільнай інтэрпрэтацыі сваіх выказванняў. Пісьмовыя падрыхтаваныя тэксты можна дапаўняць зноскамі з тлумачэннем пры неабходнасці.

З мэтай высвятлення, як людзі ўспрымаюць агонімы, было праведзена апытанне студэнтаў 1-га курса БДУіР (138 чалавек). Мы падабаралі словы, якія патэнцыйна могуць быць агнонімамі:

1. *Мілэдзі*. Ветлівы зварот у англічан да замужняй жанчыны з прывілеяваных класаў.
2. *Мотабот*. Невялікае маторнае судна.
3. *Абат*. 1) настаяцель мужчынскага каталіцкага манастыра; 2) каталіцкі свяшчэннік (у Францыі).
4. *Акропаль*. Цэнтральная ўмацаваная частка, звычайна на ўзгорку (у старажытнагрэчаскіх гарадах).
5. *Візір*. Міністр, вышэйшы саноўнік (у некаторых країнах Блізкага Усходу).
6. *Гарбарня*. Майстэрня па вырабе скур; гарбарны завод.
7. *Дыез*. Нотны знак, які абазначае павышэнне ноты на паўтона.
8. *Кадук*. Злы дух, д'ябал.
9. *Капатаж*. Від аварыі, пры якой самалёт перакульваецца цераз насавую частку пры пасадцы або ўзлёце.
10. *Кардынал*. Вышэйшы пасля папы духоўны сан у каталіцкай царкве, а таксама асоба, якая мае гэты сан.

Удзельнікі апытання раздзялілюя на тры групы. Першай групе было прапанавана ацаніць, ці ведаюць яны слова без кантэксту, паводле іх уласнай ацэнкі, пры гэтым што значыць «ведаць слова» кожны з 46-і апытаных ацэньваў сам (гэта важны элемент метамоўнай рэфлексіі). Другую групу папрасілі любым спосаб патлумачыць значэнне слова. Трэцяя група атрымала падобнае заданне – патлумачыць слова, але ў кантэксце, падабраным з Беларускага N-корпуса або інтэрнэту: *– **Мілэдзі**, не верце ей, – закаркала старая, звяртаючыся да місіс Ск'ютон. – Не верце таму, што яна гаворыць! Ёй падабаецца балбатаць дарэмна*; ***Мотабот** прызначаны для лоўлі рыбы доннымі сеткамі і выкарыстоўвае як галоўны рухавік з рэверс-рэдуктарам магутнасцю 54 кВт.; – Мы зробімся, як туман. Мы праплывем над валам. Гэты эліксір даў мне **абат** цыстэрцыянскага манастыра ў Рызе Тэадорых, брат епіскапа Альберта, – страсна блішчалі ў змроку вочы тэўтона*; *Сінела заўсёды бязвоблачнае неба, і на фоне яго невыказна прыгожа свяціўся мармур калон і статуй. Звязваючы галоўныя храмы **акропаля** з пейзажам, грэкі ставілі іх паралельна пануючаму схілу або марскому ўзбярэжжу; Гэты дзень вядомы сакрушальнай перамогай, якую нанеслі аб'яднаныя еўрапейскія харугвы войскам Асманскай імперыі – імі кіраваў Вялікі **візір** Кара-Мустафа; Пасля цёмных вулачак, дзе пахла кіслаю аўчынаю ад **гарбарань**, дзе пыхаў паравік у майстэрнях, вазок і ўвесь панскі «паязд» пацягнуўся па Губернатарскай вуліцы з асветленымі вялікімі крамамі, з натоўпам людзей на шпацыры. На кожным рагу вуліц збіраліся цікаўныя, якія пільна разглядвалі «паязд» і потым жвава распытвалі аб тым, хто гэта праехаў...; Вось кіраўнік школьнае царкоўнае капэлы, прыгожы элеганцік Пеця Мальцаў, спачатку ходзіць і бурчыць, каб мець навекі ў слабой памяці парадак **дыезаў** і бемоляў... – «фадосольрэлямісі, сімілярэсольдофа... фадосольрэлямісі, сімілярэсольдофа!.. » – чуецца ад яго хуценька-хуценька, многа-многа*

*разоў; Як пажадае хто-небудзь каму: «**кадук** цябе забяры... », то кадук з'явіцца... і забярэ...; Моцна вынесенае наперад шасі дае грубыя штуршкі пры пасадцы на хуткасці, шкодныя для самалёта: пры высока размешчаным цэнтры цяжару самалёт, які мае такое шасі, робіцца вельмі няўстойлівым з прычыны магчымага рэзкага павароту пры разгоне, што можа выклікаць нават **капатаж** пры ўзлёце; У спякотным Рыме аддаў Богу душу папа Інакенцій III, і адразу ж **кардыналы** ўсчалі між сабой грызню за папскую тыяру*.

Кожны адказ быў ацэнены па шкале -1 – -0,5 – 0 – +0,5 – +1 (адказы групы, дзе трэба было вызначыцца, ведаю ці не ведаю слова, ацэньваліся толькі цэлымі баламі). Гіпотэза, што моўцы схільны пераацэньваць сваё веданне слова, не суадносячы гэта з дакладным і поўным тлумачэннем слова, пацвердзілася. Як і пацвердзілася, што звычайна кантэкст дзейсна спрыяе разуменню значэння. Таксама праведзенае апытанне паказала, што да агнонімаў мэтазгодна адносіць, якія маюць пэўныя паказчыкі паводле паходжання, ступені актыўнасці і сферы выкарыстання, паколькі сам чалавек можа хібна ўспрымаць значэнне слова, нават не да канца яго разумеючы і ў кантэксце. Вынікі апытання пададзены на Малюнку 1.




Малюнак 1 – Вынікі апытання

Мова ўвесь час развіваецца. Жыццё мовы праяўляецца ў пастаянных зменах складу слоў і выразаў, іх значэнняў. У лёсе асобных слоў/выразаў нярэдка захоўваецца сама гісторыя народа і краіны. Такія словы, акрамя іншага, могуць утвараць клас агнонімаў. Такім чынам, у выніку даследавання намі выяўлена, што агнонімы – гэта незразумелыя ці малазразумелыя словы і выразы канкрэтнай моўнай асобы. Агнонімамі могуць быць і ўстарэлыя, і рэдкія, і агульнаўжывальныя словы. Бачыцца добрай ідэяй ствараць слоўнікі агнонімаў з мэтай павышання культуры маўлення і адукаванасці грамадства. Агнонімы характарызуюць маўленчы партрэт грамадства, які складаецца з характарыстык індывідуальнага лексікону асобы.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Плотнікаў, Б. А. Слоўнік цяжкасцяў беларускай мовы / Б. А. Плотнікаў, В. П. Трайкоўская. - Мінск : Кніжны Дом, 2004. - 542 с.*

*2. Морковкин, В. В. Русские агнонимы. Слова, которые мы не знаем; В. В. Морковкин, А. А. Морковкина ; Ин-т рус. Яз. Им А.С. Пушкина ; Ин-т рус. Яз. Им. В. В. Виноградова РАН. – М. : Астра семь ; Русские словари, 1997. – 414 с.*

*3. Савина, Е. О. Потенциально агнонимическое пространство романа Л. Н. Толстого «Война и мир» : автореф. дис. … к.ф.н.: 10.02.01 / Е. О. Савина. – Тула. – 2015 – 21 с..*